3. Заседание Международной ассоциации (комиссии) историков и архивистов стран СНГ (2 марта 2021 г.) [Электронный ресурс] // Институт всеобщей истории Российской академии наук. – Режим доступа: https://igh.ru/news/zasedanie-mezhdunarodnoi-assotsiatsii-komissii-istorikov-i-arhivistov-stran-sng-2-marta-2021-g?locale=ru. – Дата доступа: 12.04.2022.
4. Обращение глав государств–участников Содружества Независимых Государств к народам стран Содружества и мировой общественности в связи с 75-летием Победы советского народа в Великой Отечественной войне 1941–1945 годов [Электронный ресурс] // Единый реестр правовых актов и других документов Содружества Независимых Государств. – Режим доступа: http://cis.minsk.by/reestr/ru/index.html#reestr/view/text?doc=6157. – Дата доступа: 12.04.2022.
5. Положение о Международной ассоциации (комиссии) историков и архивистов государств – участников СНГ: утв. Решением Совета министров иностранных дел СНГ от 14 октября 2021 г. [Электронный ресурс] // Единый реестр правовых актов и других документов Содружества Независимых Государств. – Режим доступа: https://cis.minsk.by/reestr/ru/index.html#reestr/view/text?doc=6464. – Дата доступа: 12.04.2022.
6. Пономарева, Е. Фальсификация истории как мировоззрение Запада [Электронный ресурс] / Е. Пономарева // Фонд стратегической культуры. – Режим доступа: http://www.fondsk.ru/news/2015/06/24/falsifikacia-istorii-kak-mirovozzrenie-zapada-33981.html?utm_source=politobzor.net. – Дата доступа: 12.04.2022.
7. Постоянные представители стран СНГ при ОБСЕ выступили за бережное отношение к памятникам, погибшим во Второй мировой войне [Электронный ресурс] // Интернет-портал СНГ. – Режим доступа: https://e-cis.info/news/564/92036/?sphrase_id=36197. – Дата доступа: 12.04.2022.
8. Резолюция, принятая Генеральной Ассамблеей 16 декабря 2021 года [Электронный ресурс] // Организация Объединенных Наций. – Режим доступа: https://documents-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/GEN/N21/402/50/PDF/N2140250.pdf?OpenElement. – Дата доступа: 12.04.2022.
9. Совместное заявление государств – членов Организации Договора о коллективной безопасности «Борьба с героизацией нацизма, неонацизмом и другими видами практики, которые способствуют эскалации современных форм расизма, расовой дискриминации, ксенофобии и связанной с ними нетерпимости» [Электронный ресурс] // Министерство иностранных дел Российской Федерации. – Режим доступа: https://www.mid.ru/ru/foreign_policy/news/1786121/. – Дата доступа: 12.04.2022.
10. European Parliament resolution of 19 September 2019 on the importance of European remembrance for the future of Europe (2019/2819(RSP) [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.europarl.europa.eu/doceo/document/TA-9-2019-0021_EN.html. – Date of access: 12.04.2022.

## ГІСТАРЫЧНАЯ ПАЛІТЫКА ПОЛЬШЧЫ Ў ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНЫМ КАНТЭКСЦЕ (2004–2021 гг.)

А.Г. Цымбал (Мінск)

Гістарычная палітыка, ці палітыка памяці, з’яўляецца адносна новым полем міждысцыплінарных даследаванняў, канцэптуалізацыя паняційнага апарата якога на сённяшні дзень не з’яўляецца канчаткова аформленай. Расійская даследчыца В.Ю. Малінава [1, с. 26–27] кажа аб некалькіх сферах, у якіх гістарычная памяць знаходзіць сваю праяву ў палітыцы: 1) фарміраванне і падтрымка ідэнтычнасці групы; 2) легітымацыя палітычных рашэнняў; 3) фактар палітычнай культуры; 4) фактар прыняцця знешнепалітычных рашэнняў; 5) элемент “мяккай сілы” у знешняй палітыцы. Акрамя таго, адной з апошніх тэндэнцый з'яўляецца “сек’юрытызацыя” гістарычнай палітыкі, якая знаходзіць сваё праяву ў канцэпцыях нацыянальнай і інфармацыйнай бяспекі. Сярод пагроз для бяспекі дзяржавы агаворваецца “неаб'ектыўны перагляд гісторыі”. Таксама сцвярджаецца аб

неабходнасці замацавання ўнутры краіны і, што характэрна, за мяжой, нацыянальнай версіі гісторыі і мадэлі памяці . Пытанні памяці і ідэнтычнасці, такім чынам, разглядаюцца ў рамках “анталагічнай бяспекі” нацыі і дзяржавы, у тым ліку ў кантэксце міжнароднай бяспекі [4, p. 15–30].

Працэсы посткамуністычнай трансфармацыі ў краінах былога сацлагера ў сферы гісторыі прывялі да фарміравання новага наратыву, дзе агульнымі рысамі сталі: нацыяналізацыя гісторыі, акцэнтуацыя традыцый незалежнасці і гларыфікацыя пантэона пакутнікаў і змагароў за нацыянальны суверэнітэт, крыміналізацыя і виктымізацыя мінулага нацыі. Фарміраванне ідэнтычнасці і пазіцыянаванне сваёй краіны адбываецца праз супрацьпастаўленне гістарычным супернікам, якія выконваюць функцыю канстытуіруючага «іншага».

Класічным прыкладам рэалізацыі гістарычнай палітыкі стала Польшча, якая за апошнія 30 год прайшла шлях ад ліберальнага “крытычнага патрыятызму” да новай гістарычнай палітыкі, заснаванай на каштоўнасцях рамантычнага нацыяналізму XIX ст. [2, с. 43–65]. У пачатку 2000-х гг. у Польшчы ішлі вострыя ўнутраныя дыскусіі аб праблемах нацыяналізму і антысемітызму, узаемаадносін з акупантамі ў гады Другой сусветнай вайны. Прыкладам стала тэма ўдзелу польскага насельніцтва ў знішчэнні габрэяў у в. Ядвабне. Пасля перамогі на парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбарах у 2005 г. у Польшчы палітычнай партыі Права і справядлівасць адбыўся пералом у падыходзе да гістарычнай палітыкі. Яшчэ раней у 2004 г. пасля ўступлення Польшчы ў ЕС еўрапейскія інстытуты ў значнай ступені страцілі рычаг ціску, заснаваны на неабходнасці адпавядаць дэмакратычнай інклюзіўнай мадэлі палітыкі памяці. З гэтага часу Польшча атрымала права голасу ў фарміраванні еўрапейскай гістарычнай палітыкі, асабліва ў канструяванні наратыву Другой сусветнай вайны. Вопыт ахвяры нацызму і камунізму Польшча імкнулася выкарыстоўваць як сімвалічны капітал у адносінах з краінамі ЕС.

Акрамя ўнутрыпольскіх дыскусій аб спадчыне ПНР, у сучаснай польскай дзяржаўнасці значную ролю ў актывізацыі новай гістарычнай палітыкі Польшчы адыгралі стасункі з Расіяй. Канфрантацыя адносна патрабаванняў прызнання злачынстваў СССР у дачыненні да Польшчы стала значным фактарам, які прывёў да змены падыходаў у гістарычнай палітыцы. У лютым 2005 г. расійскае МЗС выступіла з заявай адносна рашэнняў Ялцінскай канферэнцыі 1945 г., пазітыўна ацэньваючы яе вынікі для Польшчы. Аднак у самой Польшчы гэта было ўспрынята як спроба рэабілітацыі сталінскай палітыкі [10, с. 62]. У сакавіку 2005 г. Галоўнай вайсковай пракуратурай РФ было заяўлена аб спыненні расследавання па Катынскай справе без прад’яўлення абвінавачванняў і непрызнанні факту “генацыду польскага народа”, што таксама выклікала вельмі негатыўную рэакцыю ў Польшчы.

Польскія нацыянальна-кансерватыўныя сілы не маглі не адзначыць значнасць прысутнасці ў траўні 2005 г. на памятных мерапрыемствах у Расіі прысвечаных 60-годдзю заканчэння Вялікай Айчыннай вайны больш за 90 кіраўнікоў дзяржаў і кіраўнікоў урадаў, уключаючы прэзідэнта ЗША Дж. Буша [3, p. 137–156]. Расійскі гістарычны наратыў, заснаваны на

рэабілітацыі асобных аспектаў савецкага мінулага, з таго часу пачынае актыўна прасоўвацца ва ўнутранай і знешняй палітыцы. Яго антыпольскі характар ў Расіі зацвердзіла і новае дзяржаўнае свята – Дзень нацыянальнага адзінства, які адзначаецца з 4 лістапада 2005 г. у гонар выгнання польскіх інтэрвентаў з Крамля ў 1612 г.

Расійска-польская "вайна памяцей" ў 2019 г. дасягнула стадыі ўзаемных абвінавачванняў на ўзроўні вышэйшага кіраўніцтва дзяржаў [6; 5]. Аднак гістарычныя падзеі, якія з'яўляюцца прадметам канфлікту інтэрпрэтацый, у значнай меры адбываліся на тэрыторыях паміж Варшавай і Масквой.

Менавіта кантэкст гістарычных спрэчак з Расіяй становіцца вызначальным для разумення сутнасці і беларускага вектара гістарычнай палітыкі Польшчы. Беларусь не займае цэнтральнае месца ў польскай замежнай гістарычнай палітыцы, дзе дамінуюць расійскі, украінскі і германскі напрамкі. Асноўныя дыскусіі датычацца падзей, якія адносяцца да польска-расійскіх і польска-савецкіх адносін, якія праходзілі хутчэй «над галавой» беларусаў, хоць і наўпрост закраналі іх гістарычны лёс. У гэтым духу ў 2016 г. выказваўся і кіраўнік польскага МЗС В. Вашчыкоўскі, які заклікаў не палітызаваць гісторыю, дайсці да праўды і адкрыць падзеі, якія мелі месца дзясяткі гадоў таму, за якія беларусы не нясуць адказнасці. Беларусы і палякі ў польскім дыскурсе гістарычнай палітыкі разглядаюцца як "ахвяры імперыялізмаў".

Паняцце "гістарычнай палітыкі" выразна ўкаранілася ў польскім палітычным дыскурсе. Пытанні яе інстытуцыяналізацыі, мэт і метадаў рэалізацыі абмяркоўваюцца на ўзроўні Кіраўніка дзяржавы. 17 лістапада 2015 г. пры ўдзеле прэзідэнта адбылася нарада, якая павінна была пакласці пачатак распрацоўкі стратэгіі гістарычнай палітыкі Польшчы. Прэзідэнт А. Дуда ўжо тады заявіў, што моцныя [краіны] вакол нас праводзяць вельмі інтэнсіўную гістарычную палітыку і Польшчы варта вырашыць, як выкарыстоўваць гістарычную палітыку для ўмацавання патэнцыялу дзяржавы". Беларускі аспект таксама гучаў на сустрэчы. Д-р П. Жураўскі вэл Граеўскі, адказны за знешнюю палітыку ў канцылярыі польскага прэзідэнта, заклікаў актыўна выкарыстоўваць спадчыну Рэчы Паспалітай "найбольшай супольнасці свабодных людзей у эпосе, калі гэта дзяржава існавала", якая ўяўляе "значны палітычны капітал у дачыненні да з суседзямі, асабліва беларусамі, спадкаемцамі традыцыі Вялікага Княства Літоўскага" [9]. У 2016 г. прэзідэнт Польшчы А. Дуда таксама падкрэсліваў знешні аспект гістарычнай палітыкі, што суседнія дзяржавы вядуць наступальную гістарычную палітыку і Польшча павінна ісці тым жа шляхам для пабудовы міжнароднага іміджу краіны.

На дадзены момант няма інфармацыі аб выніках распрацоўкі польскай стратэгіі гістарычнай палітыкі. Пытанні гістарычнай палітыкі знайшлі сваё адлюстраванне ў ключавых праграмных дакументах, што вызначаюць знешнюю палітыку Польшчы: Стратэгіі нацыянальнай бяспекі і Стратэгіі знешняй палітыкі. Стратэгія нацыянальнай бяспекі [7] разглядае пытанні гісторыі ў кантэксце абароны нацыянальнай ідэнтычнасці і іміджу Польшчы за мяжой. Узмацненне пазітыўнага вобразу Польшчы і яе прывабнасці ў сферы культуры і эканомікі павінна было ажыццяўляцца шляхам публічнай і культурнай дыпламатыі з улікам мэтаў гістарычнай палітыкі .

Паводле Стратэгіі польскай замежнай палітыкі на 2017–2021 гг. [8] галоўнай мэтай гістарычнай палітыкі называлася супрацьстаянне дзеянням Расіі на ўсходнім і еўрапейскім кірунку, якая, як сцвярджаецца, імкнецца распаліць гістарычныя спрэчкі паміж народамі для ўзмацнення свайго ўплыву. Гістарычная палітыка, такім чынам, будавалася на супрацьпастаўленні польскага нацыянальнага і расійска-імперскага/савецка-настальгічнага наратываў. Беларусі ў такім падыходзе адводзілася роля своеасаблівага буфера, што супрацьстаіць уплыву з усходу. У сувязі з гэтым дэкларавалася імкненне ў доўгатэрміновай перспектыве ўмацаваць здольнасць Беларусі супрацьстаяць унутраным і знешнім выклікам.

Значным, на наш погляд, з'яўляецца сцвярджэнне аб недапушчальнасці адраджэння геапалітычнага мыслення, новага "канцэрта імперый" у свеце і неаімперскага бачання гісторыі.

Найважнейшую ролю ў знешняй гістарычнай палітыцы адыгрывае падтрымка польскай ідэнтычнасці за мяжой, якую канстытуююць культура і гісторыя. З чаго выцякаюць задачы апекі над польскай культурна-гістарычнай спадчынай і месцамі памяці. Прасоўванне польскасці разглядаецца як платформа для прапаганды каштоўнасцяў, уласцівых польскай нацыі. Іх гістарычнай і цывілізацыйнай асновай называюцца: хрысціянскія карані заходняга свету, а таксама традыцыі патрыятызму і незалежнасці.

У знешнепалітычнай стратэгіі Польшчы значнае месца адводзіцца непасрэдна гістарычнай дыпламатыі, мэтай якой з'яўляецца дэманстрацыя польскага ўкладу ў развіццё еўрапейскай цывілізацыі. Адзначаецца універсальная для дыскурсу гістарычнай палітыкі задача барацьбы з фальсіфікацыяй гісторыі, а таксама ў афіцыйны дыскурс Міністэрства замежных спраў Польшчы ўводзіцца паняцце "дэфектных кодаў памяці" ("wadliwe kody pamięci"). Пад імі разумеюцца любыя дэфармацыі ў публічным дыскурсе элементаў калектыўнай гістарычнай памяці пра падзеі, якія маюць істотнае значэнне для польскай ідэнтычнасці. Відавочна, польская гістарычная палітыка, закліканая выправіць гэтыя дэфекты, і павінна даносіць "праўду пра Польскі ўклад у перамогу над нацызмам і камунізмам, а таксама панесеных стратах ад рук двух таталітарызмаў" [8]. Важнай задачай польскай замежнай гістарычнай палітыкі з'яўляецца неабходнасць зламаць распаўсюджаны тэзіс аб, як мінімум, пасіўнай адказнасці палякаў за Халакост. У гэтым дачыненні польская дыпламатыя павінна прасоўваць сцвярджэнне, што абавязковай і неабходнай умовай для Халакоста з'яўляўся падзел Польшчы Трэцім рэйхам і СССР. Ідэя роўнасці адказнасці нацысцкай Германіі і Савецкага Саюза за пакуты польскага народа ў XX ст. з'яўляецца цэнтральнай для гістарычнай палітыкі Польшчы.

Такім чынам, польскі гістарычны наратыў, што прасоўваецца за мяжой, заснаваны на двух ключавых тэзісах. Па-першае, Польшча і палякі ў гісторыі выступаюць толькі ў якасці ахвяры, але ніколі не як злачынцы. За злачынствы і канфлікты ў гісторыі адказны суседнія краіны і народы з іх таталітарнымі і імперскімі палітычнымі сістэмамі і ідэалогіямі. Па-другое, гэта выбітнасць польскага гістарычнага досведу ў барацьбе за свабоду і незалежнасць, адстойванне хрысціянскіх каштоўнасцяў. Польская мартыралогія з’яўляецца асновай для падтрымкі нацыянальнай ідэнтычнасці і лаяльнасці дыяспары да метраполіі. Гістарычная палітыка павінна спрыяць прасоўванню польскасці і фарміраванню пазітыўнага вобразу Польшчы за мяжой.

*Крыніцы і літаратура:*

1. Малинова, О.Ю. Режим памяти как инструмент анализа: проблемы концептуализации / О.Ю. Малинова // Политика памяти в современной России и странах Восточной Европы. Акторы, институты, нарративы: коллективная монография / под ред. А.И. Миллера, Д.В. Ефременко. – СПб. : Изд-во Европейского университета в Санкт-Петербурге, 2020. – С. 26–40.
2. Траба, Р. Польские споры об истории в XXI веке / Р. Траба // Pro et contra. – 2009. – № 3–4. – С. 43–65.
3. Hutchings, S. Commemorating the past/performing the present: television coverage of the Second World War victory celebrations and the (de)construction of Russian nationhood / S. Hutchings, N. Rulyova // The Post-Soviet Russian Media. – London : Routledge, 2009. – P. 137–156.
4. Innes, A.J. Memory, trauma and ontological security / A.J. Innes, B.J. Steele // Memory and Trauma in International Relations. Theories, cases and debates. Erica Resende, Dovile Budryte. – London, New York : Routledge, 2014. – P. 15–30.
5. Morawiecki: Prezydent Rosji wielokrotnie kłamał na temat Polski [Electronic resource] // Gazeta Prawna. – 2022. – Mode of access: https://www.gazetaprawna.pl/wiadomosci/artykuly/1446243,morawiecki-putin-polska-rosja-geneza-ii-wojny-swiatowej.html. – Date of access : 17.04.2022.
6. Putin, V. The Real Lessons of the 75th Anniversary of World War II [electronic resource] / V. Putin // National Interest. – 2022. – Mode of access: https://nationalinterest.org/feature/vladimir-putin-real-lessons-75th-anniversary-world-war-ii-162982. – Date of access: 17.04.2022.
7. Strategia bezpieczeństwa narodowego Rzeczypospolitej Polskiej 2020 [Electronic resource] // BBN. – 2020. – Mode of access: https://www.bbn.gov.pl/ftp/dokumenty/Strategia_Bezpieczenstwa_Narodowego_RP_2020.pdf. – Date of access: 17.04.2022.
8. Strategia Polskiej Polityki Zagranicznej 2017–2021 [Electronic resource] // MSZ. – 2020. – Mode of access: https://www.gov.pl/web/dyplomacja/strategia. – Date of access : 17.04.2022.
9. Zapis spotkania inaugurującego prace nad powstaniem Strategii Polskiej Polityki Historycznej w Belwederze, 17 listopada 2015 roku [Electronic resource] // Prezydent.pl. – 2015. – Mode of access: https://www.prezydent.pl/kancelaria/dzialalnosc-kancelarii/art,18,zapis-spotkania-dot-strategii-polskiej-polityki-historycznej.html. – Date of access : 17.04.2022.
10. Zięba, R. Poland's foreign and security policy : problems of compatibility with the changing international order / R. Zięba. – Cham : Springer, 2020. – 280 p.

## МИНИСТЕРСТВО ИНОСТРАННЫХ ДЕЛ БРАЗИЛИИ КАК ИНСТИТУТ ПУБЛИЧНОЙ ДИПЛОМАТИИ

С.Ф. Свилас, К.И. Ткачук (Минск)

Министерство внешних связей Бразилии («Итамарати»), созданное в ноябре 1823 г., является органом исполнительной власти по вопросам разработки и осуществления внешней политики и обладает материальными и кадровыми возможностями для формирования позитивного международного имиджа страны. Второе название, «Итамарати», эта правительственная структура получила в честь дворца в Рио-де-Жанейро (Бразилиа), где первоначально располагался Государственный секретариат по международным делам. Дворец принадлежал барону Итамарати и служил резиденцией республиканского правительства «Первой республики» (1889–1898), а затем, начиная с 1898 года, штаб-квартирой МИДа [1, с. 156].

В первые годы Республики в министерстве иностранных дел существенных изменений не происходило: на должностях оставались сотрудники бывшего министерства империи, привыкшие к бюрократическому